КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 37 / 10 ВЕРАСНЯ 2022 г.

# Віртуальная рэальнасць і камп'ютарызаваны чалавек...

## Ці ёсць месца для бібліятэк у будучыні?

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі адзначае 100-гадовы юбілей. Але ці ёсць у сучаснага чалавека патрэба ў друкаваных кнігах і наогул у чытанні? Адказы на гэтае пытанне здзіўляюць і прымушаюць задумацца.**



**НАСТАССЯ, 23 ГАДЫ, РЭДАКТАР САЙТА:**

— Заўсёды атрымлівала асалоду ад чытання друкаваных кніг. Да электронных амаль не звяртаюся: творы, прачытаныя з тэлефона ці камп'ютара, не так замацоўваюцца ў галаве. Хаця гэта больш тычыцца мастацкай літаратуры, якая патрабуе асаблівай атмасферы, што і стварае друкаваная кніга. З навуковымі і вучэбнымі тэкстамі працэнт — патрэбныя звесткі запамінаюцца як з электронных, так і з папяровых старонак. З пункту гледжання хуткага пошуку інфармацыі і выдзялення галоўнага, электронны дапаможнік нават выйграе.

Да кнігі звяртаюся часта: гэта мой спосаб паглядзець на свет вачыма іншых людзей, спазнаць сутнасць істотных рэчаў і вызначыць з дапамогай іх уласныя жыццёвыя прынцыпы і каштоўнасцямі. Пакуль вучылася ў школе, універсітэце — чытала тое, што брала ў бібліятэках. З нядаўняга часу пачала купляць. Ужо назбіралася невялікая ўласная бібліятэка — і гэта асаблівае задавальненне. Там і мастацкая проза, і дакументальная. Сваю паэзію яшчэ толькі шукаю. Пакуль на кніжнай паліцы сабраліся сучасныя аўтары, але ў маім спісе — здаецца, бясконцым — у класікаў асобнае месца. За іх трэба брацца падрыхтаванай.

Нацыянальная бібліятэка для мяне, бадай, ці не самае прывабнае месца ў Мінску. Такой атмасферы спакою, узнёсласці і нейкай нават сакральнасці я пакуль што нідзе не знаходзіла. У студэнцтве не раз праводзіла там час за напісаннем курсавых і дыплома. Цяпер завітваю па кнігі, якія не магу знайсці ў продажы.

Часам у гарадскіх, раённых бібліятэках мне не хапае ўтульнасці. Хацелася б, каб яны сталі месцамі, дзе ты не толькі возьмеш кнігу, але і захочаш застацца там, каб яе пачытаць.

Запісы ў маёй працоўнай кніжцы пачынаюцца з супрацоўніка бібліятэкі (яшчэ ў школьныя гады летам я падпрацоўвала ў брыгадзе па рамонце кніг). І шчыра веру, што друкаваная кніга будзе жыць заўсёды.



**АНДРЭЙ, 34 ГАДЫ, ФАТОГРАФ:**

— У бібліятэкі не хаджу. Усё, што трэба, магу знайсці ў інтэрнэце і спампоўваю ў вольным доступе. На мой погляд, друкаваныя кнігі ў бліжэйшыя 10 гадоў застануцца, але перавод бібліятэк на электронную платформу, думаю, карыстаўся б попытам. Трэба ісці ў нагу з часам. Зрабіць нешта накшталт віртуальных бібліятэк. Яшчэ аўдыякніжкі — выдатная рэч, эканоміць час. Напрыклад, можна некуды ехаць і слухаць твор. Таксама яны вельмі падыходзяць для невідушчых і людзей са слабым зрокам. Было б нядрэнна, калі б такія кніжкі яшчэ ўдасканалілі.



**ВАЛЕРЫЯ, 20 ГАДОЎ, ЦЫРУЛЬНІК:**

— Чытаю часта і шмат. Аддаю перавагу друкаванаму фармату. Падабаецца фізічны кантакт з кнігай: адчуваць яе пах, гартаць старонкі, рабіць паметкі алоўкам альбо выдзяляць важныя месцы маркерам.

У асноўным чытаю псіхалогію і філасофію. Але часам хочацца разгрузіць свае думкі, і тады бяру раман. Часцяком гэта замежная літаратура, аднак і пра беларускую не забываюся.

У бібліятэках бываю рэдка. Кнігі купляю і збіраю сваю ўласную бібліятэку. Але бывае і так, што нейкія немагчыма набыць, — тады іду ў грамадскую.

Лічу, што бібліятэкі павінны і будуць існаваць. Я толькі за друкаваныя выданні.

Для мяне важныя даступнасць і мабільнасць. У будучыні хацела б убачыць у кожным двары спецыяльныя "бібліятэчныя скрыні". А кожная бібліятэка будзе мець свой сервер або мабільны дадатак. Мы проста ўводзім назву кнігі і заказваем яе, націскаем на кнопку ў тэлефоне ці камп'ютары — і выданне з'яўляецца ў скрыні. Пасля таго, як прачыталі, вяртаем зноў у скрыню. І ідзём выбіраць новую.

Гэта дасць магчымасць узяць кнігу, не выходзячы за межы ўласнага двара.



**ІВАН, 32 ГАДЫ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

— Чытаю рэдка. У асноўным сучасную папулярную літаратуру, кшталту Дэна Браўна, якую набываю ў сецыве. Падабаецца фантастыка. Часам бывае, у інтэрнэце нешта цікавае на вочы трапіцца — тады магу за вечар і прачытаць. А вось класіку, накшталт Маркеса, Булгакава, ці ж літаратуру, датычную хобі (калекцыянаванне), прыемна мець у папяровым варыянце. Нават перавёз дзеду савецкую бібліятэку да сябе. Ведаю, шмат хто проста пазбаўляецца ад старых сямейных бібліятэк: выкідваюць ці паляць. Але я вырашыў захаваць. Цяпер каштоўныя кнігі ёсць у мяне дома (Горкі, Пушкін, Дастаеўскі, Лермантаў, Дзюма і іншыя).

У бібліятэцы быў гадоў 10 таму, ва ўніверсітэце. Думаю, іх варта зрабіць больш сучаснымі і зручнымі.



**АНАСТАСІЯ, 22 ГАДЫ, ВІДЭОГРАФ:**

— Вядома, гаджэт зручней і насіць з сабой, і чытаць. Але друкаваная кніга — гэта нешта рэальнае, а электронная — нібы ілюзія чытання. Мне падабаецца адчуваць старонкі, насіць томік з сабой. Яшчэ ёсць патрэба, каб дома былі кнігі, паліцы запаўняліся рознай літаратурай.

Чытаю часта. Вельмі падабаецца сучасная літаратура, асабліва фантастыка. Перавагу аддаю замежным пісьменнікам: Рэй Брэдбеpы, у якога магу вылучыць зборнік "Цёмны карнавал", Курт Вонегут ("Калыска для коткі"), Дэвід Мітчэл ("Сон №9"). Жанры розныя: кароткія апавяданні, аповесці, раманы. Галоўнае — цікавы сюжэт.

Вельмі зручна, што ёсць такое месца, дзе можна бясплатна ўзяць на нейкі час кнігу. Гэта таксама прыдатны варыянт для тых, каму няма дзе іх захоўваць. Шкада, што не ўсе людзі шануюць гэта.

Наша Нацыянальная бібліятэка мне вельмі падабаецца. Класныя чытальныя залы. Шмат навуковай літаратуры.

Хацелася б, каб усе бібліятэкі ўяўлялі з сябе нейкую прыгожую прастору. Дзе, апроч самога чытання, можна і гарбату-каву папіць, падсілкавацца, адпачыць. Бо часам можна знікнуць у бібліятэцы на цэлы дзень.

Спадзяюся, што папяровыя кнігі будуць жыць вечна. Зрэшты, жыццё вельмі хутка мяняецца, і магчыма ўсялякае.



**АЛЯКСАНДР, 24 ГАДЫ, НАВУКОВЫ СУПРАЦОЎНІК МУЗЕЯ:**

— Аддаю перавагу друкаванай кнізе. Падабаецца адчуваць яе пад рукой. Ні планшэт, ні тэлефон гэтага пачуцця не заменяць. Папера — гэта выгода! Імкнуся часта чытаць: навуковую літаратуру, мастацкую прозу. У апошні час знаходжу ўсякае на роднай мове і трохі вучу яе. Нешта цікавае знаходжу ў сяброў. Часам неабходнае набываю. Апошні раз быў у бібліятэцы ў студэнцкія гады. На працы ў нас ёсць свая, але гэта, хутчэй, проста сховішча кніг.

На жаль, не бачу будучыні ў бібліятэк. Здаецца, гэта нешта тое, што памірае, пераходзіць у іншыя "жанры" і кірункі. І наогул, дзейнасць бібліятэк трэба рэфармаваць (прыбіраць нікому не патрэбныя мільярды справаздач, планы па чытачах, платныя паслугі і г.д.), пачынаючы з дызайну і сканчаючы абслугоўваннем.



**АРЦЁМ, 25 ГАДОЎ, ФІТНЕС-ТРЭНЕР:**

— Выбіраю друкаваныя кнігі. У мяне праблемы са зрокам, і ад іх менш баляць вочы, менш стамляешся. Вельмі падабаецца жанр гістарычнага рамана, асабліва Вальтэр Скот.

У бібліятэцы быў даўно. Яны ў нас нядрэнныя, але ёсць куды расці.

Падаецца, гадоў праз 50 бібліятэка будзе ў кожнай галаве. Хутчэй за ўсё, зробяць нешта накшталт чыпіравання людзей, калі па сутнасці чалавек стане камп'ютарызаваным. Тады нам не спатрэбяцца ні планшэты, ні тэлефоны. Надыдзе час, калі цела, наша "абалонка", зможа знаходзіцца дома, а ў думках мы апынёмся там, дзе пажадаем. Напрыклад, у чытальнай зале. Або ж захацэў — і перамясціўся ў цішы, прыемнае месца ў лесе, дзе сядзіш пад вялікім старым дубам і чытаеш кнігу.

Друкаваныя кнігі мо і застануцца, але будуць, хутчэй за ўсё, як антыкварыят, раскоша. Дазволіць іх сабе змогуць толькі абраныя.



**ВІКТОРЫЯ, 21 ГОД, ПОВАР:**

— Для мяне зручнейшы электронны фармат. Можна пачытаць у любы момант, калі з'яўляецца вольная хвілінка. Напрыклад, калі едзеш у грамадскім транспарце. Гэта эканоміць час, такі каштоўны ў сучасным жыцці. Электронны варыянт не так цяжка насіць, як папяровы: у адным невялікім гаджэце можна сабраць цэлую бібліятэку. Яшчэ адзін з плюсаў — тое, што ён таннейшы. Шмат чаго можна спампаваць бясплатна. У інтэрнэце ёсць абсалютна ўсё, што патрэбна, — літаратура з любой краіны, любога аўтара. Гэта ж дзівосна. Тэхналогіі робяць цуды.

На жаль, чытаю нячаста. Не заўсёды ёсць час. Падабаецца літаратура, заснаваная на рэальных падзеях. Таксама цікавіць фантастыка. Вельмі запала ў душу кніга «Той, хто бяжыць за ветрам» Халеда Хасейні. Апошняе, што перачытала, — "Стары і мора" Эрнэста Хэмінгуэя.

У бібліятэцы была гады два таму. Хадзіла з-за вучобы, але часам брала нешта пачытаць для свайго задавальнення. Мне падаецца, што ў нашых бібліятэках не хапае асартыменту. Асабліва ў маленькіх — не заўжды знойдзеш тое, што трэба.

Хацелася б, каб нашы бібліятэкі сталі больш атмасфернымі, утульнымі, цёплымі. Месцам, куды людзі прыходзілі б пачытаць, захутаўшыся ў плед, з кубачкам гарбаты ці кавы. Яшчэ было б крута, калі б з'явіўся кур'ер, які б дастаўляў кнігі дадому.

Падаецца, бібліятэкі будуць жыць заўсёды. Магчыма, будучыня за віртуальнымі кнігасховішчамі. Калі ты проста надзенеш акуляры віртуальнай рэальнасці і зможаш апынуцца ў бібліятэцы любога кутка свету. Можа, такое ўжо і ёсць, але я не ў курсе.

**Ганна САКАЛОВА**